# СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА БЕЛАРУСІ ЗА СОРАК ГОД

**Разам з усімі працоўнымі дастойную сустрэчу слаўнаму юбілею—40-годдзю БССР рыхтуе калгаснае сялянства нашай рэспублікі.**

**За гады Савецкай улады сельская гаспадарка Беларусі з дробнай, раздробленай, малапрадуктыўнай ператварылася ў буйную, высокамеханізаваную сацыялістычную гаспадарку.**

## Край убогі і жабрацкі...

«Ёсць на Русі нямала месц халодных і галодных, але мала можна знайці вялізных краёў, такіх сумных і бедных, якая Беларусь»—так характарызаваў калісьці дарэвалюцыйнае мінулае нашай рэспублікі аўтар вядомай кнігі «Беларусь і беларусы» — Папоў. І сапраўды, працавіты і горды беларускі народ, прыгнечаны нястачай і памешчыцка-капіталістычнай эксплуатацыяй, прыгнятаемы царскім самадзяржаўем, вымушан быў жыць да Вялікага Кастрычніка ў цемры і страшэннай галечы.

У пераважнай большасці сяляне Беларусі былі пазбаўлены зямлі. 66,5 працэнта ўсёй зямлі належала памешчыкам, царкве і манастырам, а на долю сялянскіх двароў прыпадала толькі 33,5 працэнта непрыдатных зямель. З усіх сялянскіх гаспадарак 68 працэнтаў складалі беднякі. Ім належала ўсяго толькі 35,7 працэнта ўсіх наяўных у сельскай гаспадарцы Беларусі коней, 25,5 працэнта пасеваў сельскагаспадарчых культур і менш адной чвэрці валавога збору збожжа і бульбы.

Зямля апрацоўвалася прымітыўнымі сельскагаспадарчымі прыладамі—сахой, драўляным плугам і бараной. У выніку слаба развітай жывёлагадоўлі ў глебу ўносілася мала ўгнаенняў, ураджаі былі вельмі нізкімі. Сяляне хранічна галадалі, дзесяткамі тысяч паміралі ад голаду і эпідэмій.

Сялянскія гаспадаркі былі прыгнечаны непасільным цяжарам ўсялякіх падаткаў і плацяжоў. Сяляне Беларусі толькі за карыстанне надзельнымі землямі выплачвалі памешчыкам 127 мільёнаў рублёў золатам. Мільёны рублёў яны плацілі землеўласнікам за куплю і арэнду зямлі. Жылі хлебаробы ў курных хацінах, у якіх утрымлівалася нярэдка і хатняя жывёла. Паўсюдна панавала непісьменнасць.

У пошуках кавалка хлеба і лепшай долі сяляне тысячамі пакідалі Беларусь і накіроўваліся ў іншыя губерні Расіі, эмігрыравалі за граніцу. Падлічана, што за 50 дарэвалюцыйных год з Беларусі разышлося па ўсяму свету больш 1.378 тысяч чалавек, не лічачы дзяцей.

## Па шляху калектывізацыі

Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя з'явілася для беларускага народа сапраўды выратавальніцай. Яна ліквідавала памешчыкаў і капіталістаў і адкрыла працоўным шырокі шлях свабоды і працвітання.

Дзякуючы пастаяннай дапамозе Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада сельская гаспадарка Беларусі хутка развівалася. Ужо да 1925—26 гадоў яна ў асноўным дасягнула даваеннага ўзроўню, а да 1928 года—перавысіла яго.

Абапіраючыся на поспехі сацыялістычнай індустрыі, партыя ўзяла курс на калектывізацыю сельскай гаспадаркі. Ужо ў 1929 годзе ў Беларусі пачалося масавае ўступленне сялян у калгасы. Да канца 1932 года яны ўжо аб'ядноўвалі больш палавіны сялянскіх гаспадарак, а ў 1936 годзе калектывізацыя сельскай гаспадаркі рэспублікі была ў асноўным завершана. На гэтай аснове быў ліквідаван эксплуататарскі клас у вёсцы — кулацтва.

Калектывізацыя адкрыла небывалыя перспектывы для развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці ў рэспубліцы. Хутка павялічвалася пагалоўе жывёлы на калгасных фермах, няўхільна ўзрастала ўраджайнасць сельскагаспадарчых культур. У 1935 годзе за выдатныя поспехі на працягу раду год у галіне сельскай гаспадаркі і ў галіне прамысловасці Беларусь была ўзнагароджана ордэнам Леніна.

Уз'яднанне Заходніх абласцей Беларусі ў 1939 годзе ў адзінай Савецкай дзяржаве адкрыла шлях да шчаслівага калгаснага жыцця мільёнам працаўнікоў вёскі гэтых абласцей.

Беларускі народ распачаў ажыццяўленне сваёй адвечнай мары — асушэнне балот і іх гаспадарчае выкарыстанне. У 1940 годзе пасяўная плошча ў Беларусі ў параўнанні з 1913 годам расшырылася на 670 тысяч гектараў. У параўнанні з 1916 годам пагалоўе буйнай рагатай жывёлы ў рэспубліцы павялічылася на 550,6 тысячы галоў, колькасць свіней — на 76 тысяч галоў, авечак і коз—на 527,9 тысячы галоў.

На палях калгасаў і саўгасаў працавала 13,4 тысячы трактараў (у 15-сільным вылічэнні), 1,7 тысячы камбайнаў, 3,1 тысячы сеялак і многа іншых сельскагаспадарчых машын. Калгасы і саўгасы мелі ў сваім распараджэнні 6,1 тысячы грузавых аўтамабіляў. Да пачатку 1941 года было электрыфікавана больш 500 калгасаў, большасць машынна-трактарных станцый і саўгасаў.

У перадваенныя гады па рэспубліцы было сселена ў добраўпарадкаваныя калгасныя цэнтры 220 тысяч хутароў.

Мірная стваральная праца беларускага народа была перапынена ў 1941 годзе вераломным нападам фашысцкай Германіі. За гады акупацыі гітлераўцы нанеслі сельскай гаспадарцы Беларусі велізарныя страты, якія склалі звыш 48 мільярдаў рублёў. Захопнікі спустошылі ўсе калгасы і саўгасы, спалілі 9,2 тысячы сёл і вёсак, знішчылі 415 тысяч жылых дамоў і 533 тысячы гаспадарчых пабудоў. Пагалоўе буйнай рагатай жывёлы ў рэспубліцы зменшылася на 69 працэнтаў, авечак—на 78 працэнтаў, свіней—на 89 працэнтаў. Амаль напалавіну скарацілася пасяўная плошча. Поўнасцю была знішчана тэхнічная і энергетычная база.

## Роскліт калгаснай вёскі

У неймаверна цяжкіх умовах давялося беларускаму народу пасля вызвалення аднаўляць разбураную сельскую гаспадарку. Неацэнную дапамогу ў гэтым аказалі брацкія народы і, у першую чаргу, вялікі рускі народ. З розных раёнаў нашай неабсяжнай Радзімы ў Беларусь адпраўляліся эшалоны з машынамі, насеннем, жывёлай. Савецкі ўрад яшчэ ў час вайны асігнаваў на аднаўленне сельскай гаспадаркі рэспублікі 429 мільёнаў рублёў. Гэтая дапамога ўзрастала з кожным годам.

Дзякуючы перавагам калгаснага ладу, штодзённым клопатам і дапамозе ЦК КПСС і Савецкага ўрада, самаадданай працы рабочых і калгаснікаў, сельская гаспадарка Беларусі была не толькі аднаўлена ў кароткі тэрмін, але і дасягнула значных поспехаў у далейшым развіцці. Ужо ў 1950 годзе ў параўнанні з 1940 годам пагалоўе буйнай рагатай жывёлы ў калгасах узрасло на 33,2 працэнта. Да 1953 года пасяўная плошча рэспублікі дасягнула 98,4 працэнта да даваеннага ўзроўню. У 1953 годзе непадзельныя фонды калгасаў павялічыліся ў 2,2 раза, а грашовыя даходы ўзраслі ў тры разы ў параўнанні з 1940 годам.

Асабліва бурнымі тэмпамі развівалася сельская гаспадарка Беларусі пасля верасноўскага Пленума ЦК КПСС. Умацаванне калгасаў высокакваліфікаванымі кадрамі кіраўнікоў і спецыялістаў, павышэнне ўзроўню механізацыі сельскагаспадарчых работ і іншыя мерапрыемствы адыгралі станоўчую ролю. За два гады, якія прайшлі пасля верасноўскага Пленума, пасяўная плошча ў рэспубліцы павялічылася на 324 тысячы гектараў, або на 6,3 працэнта, і значна перавысіла даваенны ўзровень. Вытворчасць мяса за гэты перыяд узрасла на 40,7 працэнта і малака — на 17,6 працэнта.

Важнае значэнне для далейшага арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў мела аб'яднанне дробных сельскагаспадарчых арцелей у буйныя, увядзенне новага парадку планавання сельскагаспадарчай вытворчасці, павышэнне матэрыяльнай зацікаўленасці калгаснікаў у выніках сваёй працы.

Сельская гаспадарка рэспублікі з году ў год аснашчаецца ўсё ўзрастаючай колькасцю першакласнай тэхнікі. У цяперашні час у калгасах, саўгасах і РТС Беларусі ёсць каля 44 тысяч трактараў (у 15-сільным вылічэнні), 16 тысяч грузавых аўтамашын, 10 тысяч камбайнаў, каля 4 тысяч ільнокамбайнаў і ільноцерабілак і многа іншых складаных сельскагаспадарчых машын. Няспынна расце ўзровень механізацыі ў жывёлагадоўлі і кармаздабыванні. Гэта стварае спрыяльныя ўмовы для далейшага росту вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі.

У 1957 годзе ў параўнанні з 1953 годам вытворчасць збожжа ў Беларусі ўзрасла на 44 працэнты, бульбы — на 40 працэнтаў, ільноволакна — у 3,5 раза. За гэты перыяд вытворчасць малака ў калгасах і саўгасах павялічылася ў 2,7 раза і мяса (у забойнай вазе)—у 1,4 раза, у тым ліку свініны—у 2,4 раза. За яшчэ больш высокія паказчыкі змагаюцца працаўнікі сельскай гаспадаркі ў гэтым годзе.

Партыя і ўрад высока ацанілі працу работнікаў калгаснай вёскі. Тысячы з іх адзначаны высокімі ўрадавымі ўзнагародамі. Толькі ў гэтым годзе 32 перадавікі сельскай гаспадаркі былі ўдастоены высокага звання Героя Сацыялістычнай Працы і каля 5 тысяч чалавек узнагароджана ордэнамі і медалямі Савецкага Саюза.
















## Да новых поспехаў

Натхнёныя рашэннямі XX з'езда КПСС, працаўнікі сельскай гаспадаркі Беларусі настойліва змагаюцца за тое, каб у бліжэйшыя чатыры гады паспяхова вырашыць пастаўленую партыяй і ўрадам агульнанародную задачу—дагнаць Злучаныя Штаты Амерыкі па вытворчасці мяса, малака і масла на душу насельніцтва.

Каб перамагчы ЗША ў мірным спаборніцтве, калгасы і саўгасы рэспублікі павінны да 1961 года павялічыць супраць 1957 года вытворчасць мяса ў 4,9 раза і малака—у 2,9 раза. Гэта значыць, што на кожныя сто гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў неабходна атрымаць мяса ў калгасах да 85 цэнтнераў (супраць 17 цэнтнераў у 1957 годзе) і ў саўгасах—да 100 цэнтнераў (супраць 33,7 цэнтнера); малака ў калгасах і саўгасах—да 280 цэнтнераў (супраць 95,6 цэнтнера). Сярэднягадавы ўдой на карову павінен быць у 1961 годзе даведзен у калгасах да 2200 кілаграмаў (супраць 1575 кілаграмаў у 1957 г.) і ў саўгасах—да 2700 кілаграмаў (супраць 2298 кілаграмаў).

Задача зусім рэальная і выканальная. Яна павінна вырашацца як за кошт павелічэння пагалоўя жывёлы, так і за кошт умацавання кармавой базы. Трэба ўсямерна расшыраць пасевы кармавых культур, пры гэтым важнейшая роля павінна быць адведзена кукурузе. Неабходна настойліва павышаць ураджайнасць сельскагаспадарчых культур.

Цяпер працаўнікі сельскай гаспадаркі рэспублікі спаборнічаюць за дастойную сустрэчу нечарговага XXI з'езда КПСС.

(БЕЛТА).

Рэдактар І. НАЛІВАЙКА.